“Альфа” запрашае на ўік-энд са Святым Духам

Аўтар: Ангеліна Пакачайла
20.09.2015 01:00



З 9 верасня ў пабрыгіцкім касцёле распачаўся курс “Альфа”. Першы занятак наведала 30 чалавек ва ўзросце 17–75 гадоў. **Што гэта за курс, і хто можа яго наведваць?**

“Альфа” – гэта цыкл размоў пра хрысціянства, адкрыты для людзей усіх веравызнанняў. Курс распрацаваны яшчэ ў канцы 1970-х гадоў вікарыем касцёла Святой Тройцы ў Лондане. Сёння праграма “Альфы” складаецца з 10-15 тэм і выезду на “ўік-энд са Святым Духам”.

Уводная тэма гучыць як “Хрысціянства:
сумна, ілжыва, не важна”.

У праграме кожнай сустрэчы – вячэра, выклад тэмы і свабодная дыскусія папытаннях, якія цікавяць удзельнікаў.

Курс не служыць заменай катэхезы. Гэта хутчэй частка агульнай праграмы па катэхізацыі і евангелізацыі.

Перавага курса заключаецца ў тым, што ён дазваляе людзям абмеркаваць духоўныя пытанні ў нефармальнай абстаноўцы.

Гэта ўнікальная магчымасць падзяліцца ўласнымі думкамі, вопытам і выслухаць меркаванні розных цікавых людзей. † У Гродне курс “Альфа” ўпершыню правялі 2 гады таму маладыя католікі з Варшавы. За гэты час курс скончыла каля 80 чалавек. У дадзены момант распачынаецца набор на 4 курс. Заняткі праводзіць група лідэраў пад кіраўніцтвам ксяндза Антонія Грэмзы.

“Я радуюся, калі бачу ў людзях ажыўленне веры, – зазначае ксёндз Антоній. – Бо вера – гэта не нешта сумнае, закасцянелае, але жывое. І вельмі важна, каб людзі запальваліся гэтай жывой верай”.

“Альфа” запрашае на ўік-энд са Святым Духам

Аўтар: Ангеліна Пакачайла
20.09.2015 01:00







“Альфа” запрашае на ўік-энд са Святым Духам

Аўтар: Ангеліна Пакачайла
20.09.2015 01:00



